культурно-просветительских и досуговых учреждений дают высокие результаты. Обучающиеся успешно представляют Глазов на городских, республиканских, всероссийских и международных конкурсах, олимпиадах и конференциях, выигрывают и реализуют грантовые проекты, сотрудничают с молодёжью вновь присоединённых территорий и с иностранными студентами, помогая им социализироваться в условиях поликультурного региона.

Список использованной литературы

1. Захарова, Е. Н. Изучение удмуртской литературы в курсе русской литературы: Авторская программа. Тематическое планирование / Е. Н. Захарова, Г. А. Мышкина. – Глазов, 2006. – 33 с.

2. Закирова, Н. Н. Наше культурное достояние : учеб.-метод. пособие / Н. Н. Закирова. – Глазов, 2007. – 368 с.

3. Закирова, Н. Н. Курс краеведческого марафона ГГПИ – воспитание отчизнолюбия молодежи / Н. Н. Закирова // Актуальные вопросы отечественной теории и практики социального воспитания подрастающего поколения : сб. науч. тр. Всеросс. науч.-практ. конф. – Глазов : ГГПИ, 2022. – С. 62–69.

## ЗАГАЛОЎКІ ПАЭТЫЧНАГА ЗБОРНІКА МАКСІМА ТАНКА «ПЕРАПІСКА З ЗЯМЛЁЙ» З КАМПАНЕНТАМ-ОНІМАМ

**Барадаўка Ксенія (УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, Беларусь)**
**Навуковы кіраўнік – В. Р. Слівец, канд. філал. навук**

Загаловак літаратурнага твора займае асобае палажэнне ў яго структуры, выступаючы кампанентам мастацкага тэксту і адначасова яго ўласнай назвай. «Загаловак як імя мастацкага твора выдзяляе названы ім аб’ект з ліку падобных, індывідуалізуе яго. Разам з тым ён звязаны з іншымі значнымі кампанентамі тэксту канцэптуальнай сувяззю, у чым і выяўляецца адрозненне загалоўка ад тыповага ўласнага імя» [1, с. 35].

Мэтай нашага даследавання стала вылучэнне і апісанне функцый загалоўкаў твораў паэтычнага зборніка Максіма Танка «Перапіска з зямлёй», якія ў сваёй структуры ўтрымліваюць уласныя імёны.

Было падлічана, што ў прааналізаваны паэтычны зборнік увайшлі 170 вершаў, з іх 68 не маюць загалоўкаў і 24 маюць у сваім складзе ўласнае імя (пераважна тапонімы ці адтапанімічныя ўтварэнні).

Паводле сваёй структуры вылучаныя намі загалоўкі выражаюцца:

– словаформамі (напрыклад, *«Сцікс», «Енісей»*);
– словазлучэннямі з падпарадкавальнай сувяззю (*«Мацi з Пурчупіса», «Песня Кабзара», «Хірасімская калыханка»*);
– сказам (*«Гісторыя вёскі Пількаўшчына», «Сасна на Слабадскім пагосце»*).

Загаловак можна разглядаць як своеасаблівую «рэкламу» да мастацкага твора, якая быццам падказвае чытачу, аб чым пойдзе размова ў ім. За кошт гэтага рэалізуецца катэгорыя праспекцыі і, адпаведна, вяўляюцца прагназуючая і арыентуючая функцыі загалоўка.

Загалоўкі, у склад якіх уваходзяць антрапонімы, як правіла, непасрэдна ўказваюць на галоўнага героя твора. Пры ўмове, што названае ў загалоўку імя вядома шырокаму колу чытачоў, катэгорыя праспекцыі выражаецца найбольш выразна. У прааналізаваным зборніку вершаў М. Танка зафіксаваны толькі два антрапанімічныя загалоўкі: *«Песня Кабзара»* (*Кабзар* – мянушка-псеўданім Тараса Шаўчэнкі – украінскага пісьмнніка, мастака, этнографа і грамадскага дзеяча, – утвораная ад аднайменнай назвы яго паэтычнага зборніка) і *«Салчак Тока»* (імя тувінскага савецкага дзяржаўнага дзеяча і пісьменніка).

Катэгорыя лакальнасці ў загалоўках акрэсліваецца за кошт ужывання тапонімаў і адтапанімічных утварэнняў, якія канкрэтызуюць прасторавае вымярэнне мастацкага твора ці ствараюць фон дзеяння (*«Возера Чэдар», «Пасёлак Шушанскі», «У Саянах», «Усінскі тракт», «За Палярным кругам», «Нарыльская тундра», «На трасе Варкута і Хальмер-Ю»* і інш.). Тэмпаральныя адносіны выражаюць онімы-хранонімы – уласныя імёны, якія абазначаюць адрэзкі часу (напрыклад, *«У аптэцы перад Новым годам»*). Такім чынам, падобныя загалоўкі, якія абазначаюць час і прастору, актуалізуюць катэгорыю лакальна-тэмпаральнай аднесенасці тэксту.

Пэўныя онімы за кошт сваёй прэцэдэнтнасці надаюць загалоўкам, у склад якіх уваходзяць, алюзійны характар. Так, арыентуючую функцыю будзе выконваць загаловак *«Хірасімская калыханка»*, бо ўтрымлівае «адсылку» да трагічна вядомых падзей 1945 года – атамнай бамбардзіроўкі японскіх гарадоў *Хірасіма* і *Нагасакі*.

Інтэртэкстуальны характар набывае і загаловак верша *«Сцікс»*, які скіроўвае да прэцэдэнтнага тэксту – шырока вядомага міфалагічнага сюжэта (*Сцікс* – у старажытнагрэчаскай міфалогіі ўвасабленне першабытнага жаху і цемры, з якіх узніклі першыя жывыя істоты, і персаніфікацыя аднайменнай міфічнай ракі).

Як бачым, загаловак знаходзіцца ў цеснай сувязі з тэматыкай, вобразамі і ідэйнай накіраванасцю твора, з'яўляецца часткай мастацкага кантэксту. Семантыка ўласных імёнаў, якія ўваходзяць у структуру прааналізаваных загалоўкаў, у першую чаргу, спрыяюць узмацненню прагназуючай і арганізуючай функцый, выяўляючы катэгорыі лакальнасці, тэмпаральнасці, антрпацэнтрычнасці і інтэртэкстуальнасці.

*Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы БРФФД (грант №Г22М-038).*

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Слівец, В. Загаловак як галоўны кампанент анамастычнай прасторы мастацкага тэксту / В. Слівец. – Роднае слова. – 2020. – № 6. – С. 35–38.

2. Танк, М. Зб. твор. : у 13 т. / М. Танк ; рэд. тома В. П. Рагойша ; падрыхт. тэкстаў і камент. В. Ў. Карачун. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – Т. 4 : Вершы (1964–1972). – 384 с.